**24.** Выберыце з дадзеных назоўнікі, якія ў форме адзіночнага ліку творнага склону маюць падаўжэнне зычных: *1) дэталь; 2) здань; 3) мадэль; 4) літасць.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** усе назоўнікі, акрамя 4. **В)** 1, 3.
**Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**25.** Разгадайце рэбус і вызначце, дзе схавалася *назва кругавога, лейкападобнага руху вады на рацэ, які ўзнікае ад сутыкнення сустрэчных плыней.*

| 1) | 2) | 3) | 4) |
|---|---|---|---|
| **В Р** |  | $\frac{ё}{м}$ | **СЗж** |

**А)** няма такой назвы. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**26.** Колькі слоў у сказе: *Паабапалдарогіросмінулымлетамгоркіпалын.*

**А)** 5. **Б)** 6. **В)** 7. **Г)** 8. **Д)** 9.

**27.** Хто з беларускіх мастакоў слова сказаў: *"Рупная пчала ўмее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак."*

**А)** Уладзімір Дубоўка. **Б)** Якуб Колас. **В)** Максім Багдановіч.
**Г)** Кандрат Крапіва. **Д)** Максім Танк.

**28.** Якое слова з прыведзеных у залежнасці ад націску можа ўжывацца ў ролі назоўніка і прыметніка: *1) пяты; 2) сталы; 3) каса; 4) свая; 5) вараны.*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**29.** Рымляне гэтым словам называлі сузор'е Вялікага Пса, а таксама і час, калі Сонца пры сваім руху знаходзілася ў гэтым сузор'і. Адсюль жа і пайшла назва …

**А)** дыплома. **Б)** атэстата. **В)** партфеля. **Г)** канікул. **Д)** дзённіка.

**30.** Я. Ф. Карскі да першага тома сваёй працы "Уводзіны ў вывучэнне мовы і народнай славеснасці" ўзяў вершаваныя радкі:

*Сонца навукі скрозь хмары цёмныя*
*Прагляне ясна над нашай ніваю,*
*І будуць жыцці дзеткі патомныя*
*Добрай доляй, доляй шчасліваю.*

Хто з беларускіх паэтаў з'яўляецца аўтарам гэтых радкоў?

**А)** Пятро Глебка. **Б)** Пятрусь Броўка. **В)** Янка Лучына.
**Г)** Паўлюк Багрым. **Д)** Паўлюк Трус.

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.
220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218; тэл. (017) 292 80 31, 292 34 01, 290 01 53;
e-mail: info@bakonkurs.by; http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 11. Тыраж 29100 экз. г. Мінск. 2010 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2010»

*Чацвер, 18 лютага 2010 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

## Заданне для вучняў 7-8 класаў

**1.** Якую літару неабходна ўставіць на месцы пропускаў у вершаваных радках М. Пазнякова:

*Я ў лес прыходзі.. сябрам,* *Бы.. рады гукам, фарбам,*
*галінак не лама.. .* *хадзі.., запаміна.. .*

**А)** л. **Б)** м. **В)** ў. **Г)** й. **Д)** ш.

**2.** Дадзены словазлучэнні: *1) прыгожа спяваюць; 2) вучні ў школе; 3) ветлівы зварот; 4) хутчэй пайсці.* Выберыце словазлучэнне з залежным словам прыметнікам.

**А)** няма такога словазлучэння. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**3.** У якіх словах з прыведзеных замест кропак патрэбна напісаць літару ***ь***:

*1) дзен..; 2) сем..; 3) дзевяц..; 4) ноч..; 5) восем.. .*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3. **В)** 1, 2, 5. **Г)** 3, 4. **Д)** 3, 5.

**4.** Вызначце з прыведзеных правільна напісаныя словазлучэнні: *1) дубовая шафа; 2) правільны дроб; 3) смачная кава; 4) новы гармонік.*

**А)** няма правільна напісаных словазлучэнняў.
**Б)** усе словазлучэнні напісаны правільна. **В)** 1, 4. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**5.** У якіх словах з прыведзеных замест кропак патрэбна ўставіць літару ***э***:

*1) орд..н; 2) д..сант; 3) ш..рань; 4) р..цэпт.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 2. **В)** 1, 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**6.** Дадзены словазлучэнні: *1)* ***аддаць*** *кнігу; 2)* ***дзюбы*** *кранаў; 3)* ***рэзаць*** *алмазам; 4)* ***лёгкая*** *дарога; 5)* ***новы*** *гадзіннік.*
Якія выдзеленыя словы ўжыты ў пераносным значэнні?
**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 5.

**7.** У выглядзе чаго існавалі старажытныя папірусныя кнігі?
**А)** у выглядзе сшыткаў. **Б)** у выглядзе брашур. **В)** у выглядзе скруткаў.
**Г)** у выглядзе малюнкаў. **Д)** у выглядзе блакнотаў.

**8.** Колькі пар антонімаў у вершаваных радках А. Вярцінскага:

*Любоў і лад узвышаюць,* *Варожасць і злосць прыніжаюць,*
*Вядуць за далягляд.* *Адкідаюць назад.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**9.** *Невялікая затока ў рэчцы з павольным цячэннем называецца …*
**А)** балотам. **Б)** крыніцай. **В)** завоінай. **Г)** лужынай. **Д)** канавай.

**10.** Колькі прыслоўяў ужыта ў вершаваных радках Якуба Коласа:

*О, як добра ў лузе ў час палудны!* *За лясы плывуць.*
*Лёгка там дыхнуць!* *Ветрык краскі чуць калыша,*
*Хмаркі белыя марудна* *Травы шалясцяць.*

**А)** няма прыслоўяў. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

**11.** Закончыце народную прыказку: *З мора вады не выбераш, з песні слова …*
**А)** не запомніш. **Б)** не спячэш. **В)** не выкінеш.
**Г)** не страціш. **Д)** не забудзеш.

**12.** Выберыце з дадзеных словы, у якіх націск падае на першы склад:
*1) камбайнер; 2) супавы; 3) аркуш; 4) гліняны; 5) мігаць.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** 1, 3, 4. **В)** 2, 3. **Г)** 3, 4, 5. **Д)** 4, 5.

**13.** Дадзены словазлучэнні:
*1) незнаём.. постаць; 2) невыразн.. цень;*
*3) старажытн.. летапіс; 4) мазоліст.. далонь.*
Якія прыметнікі з дадзеных маюць канчатак ***-ы***?
**А)** усе прыметнікі. **Б)** няма такіх прыметнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**14.** Дадзены назоўнікі: *1) інжынераў; 2) акуней; 3) гусей; 4) цётак; 5) братоў.*
Якія словы запісаны правільна ў форме множнага ліку вінавальнага склону?
**А)** усе словы. **Б)** усе словы, акрамя 2. **В)** 1, 3, 5.
**Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**15.** Выберыце словы, якія маюць у сваім саставе: **корань** + **суфікс** + + **канчатак**: *1) саспелая; 2) дрымучы; 3) палічаны.*
**А)** усе словы. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**16.** З гісторыі да нашых дзён дайшлі звесткі пра старажытныя слуцкія паясы, іх адметнасць і сімвалічнасць. Сімвалам чаго ў даўнія часы былі паясы? Выберыце правільны(-ыя) варыянт(-ы):
*1) дабрабыту; 2) беднасці; 3) палахлівасці.*
**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1. **Г)** 1, 2. **Д)** 3.

**17.** У якіх дадзеных словах на месцы пропуску напішаце літару ***я***:
*1) нап..чы; 2) сн..гір; 3) выдз..ліць; 4) в..чысты; 5) б..рэт; 6) б..ляш.*
**А)** ва ўсіх словах. **Б)** ва ўсіх словах, акрамя 3. **В)** 1, 2, 4, 6.
**Г)** 2, 3, 5. **Д)** 3, 4, 5.

**18.** У даўнія часы рабочага, які вырабляў шкло, называлі …
**А)** доменшчык. **Б)** гутнік. **В)** фанатэкар.
**Г)** фрэзероўшчык. **Д)** імітатар.

**19.** Якую сінтаксічную ролю можа выконваць назоўнік у сказе? Выберыце патрэбныя варыянты: *1) дзейнік; 2) выказнік; 3) акалічнасць; 4) азначэнне; 5) дапаўненне.*
**А)** усе варыянты правільныя. **Б)** усе варыянты, акрамя 4.
**В)** 1, 2, 5. **Г)** 1, 3, 4. **Д)** 3, 4, 5.

**20.** Ад старaславянскага словазлучэння “тьи” і “дьнь” утварылася сучаснае слова …
**А)** тыльны. **Б)** тысяча. **В)** тэлефон. **Г)** тыдзень. **Д)** тэрмометр.

**21.** Якое значэнне мае фразеалагічны выраз ***душа ў душу***?
**А)** звычайна. **Б)** дружна. **В)** зусім блізка. **Г)** дакладна. **Д)** няшчыра.

**22.** Дадзены тэкст:
*Хлеб – часцінка нашага жыцця. Нездарма кажуць у народзе: “Хлеб – усяму галава.” Хлебам-соллю нашы бацькі пачыналі зажынкі, з хлебам-соллю выходзілі насустрач самым жаданым гасцям, хлебам-соллю ў час вяселляў сустракаюць па сённяшні дзень маладых. Калі выпадкова кавалачак хлеба падаў на падлогу, яго падымалі і прасілі прабачэння. Гэтым паказвалі павагу працы хлебароба.*
*Нашы дзяды і бацькі, бабулі і матулі ўмелі шанаваць хлеб. Гэту традыцыю мы павінны захаваць і прадоўжыць.*
Вызначце стыль тэксту і тып маўлення. *1) мастацкі стыль; 2) гутарковы стыль; 3) тып апавяданне; 4) тып апісанне; 5) тып разважанне.*
**А)** 1, 3. **Б)** 1, 4. **В)** 1, 5. **Г)** 2, 4. **Д)** 2, 5.

**23.** Выберыце правільна напісанае слова.
**А)** прэтандэнт. **Б)** прытэндэнт. **В)** прытындэнт.
**Г)** прэтындэнт. **Д)** прэтэндэнт.